# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilee

## Ираида Осиповна ЦАРЮК

## Іраіда Осіпаўна ЦАРУК

## Iraida Osipawna CARUK



Юбілейную дату 29 лютага 2018 г. адзначыла выдатны арганізатар гістарычнай адукацыі і навукі, дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1973–1986), заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, доктар гістарычных навук, прафесар, Чалавек з вялікай літары Іраіда Осіпаўна Царук.

Фармат прапануемай публікацыі не прадугледжвае навуковага асэнсавання жыццёвага, творчага, адміністрацыйнага шляху, які плённа і годна прайшла гэта прыгожая ва ўсіх сэнсах жанчына-гісторык. Аднак напісаць такую працу будзе неабходна, бо ўзоры навуковых біяграфій прысутнічаюць у выдавецкай традыцыі БДУ, а ў дачыненні да «гістарычнасці» асобы І. О. Царук ёсць шмат прыкладаў, якія адназначна пацвярджаюць: гісторыю ва ўсіх яе складніках заўсёды стваралі і рухалі наперад людзі. Людзі, што вылучаліся сваёй грамадскай і інтэлектуальнай крэатыўнасцю, нераўнадушнасцю да ўласнай справы, жыцця краіны і народа, адметныя сваімі ўнёскамі ў тую сферу, да якой яны належалі.

Іраіда Осіпаўна – сапраўднае ўвасабленне беларускай універсітэцкай багіні Кліа! Яна прайшла амаль усе прыступкі прафесійнага сталення. Выкладчык і вучоны, патрабавальны, прынцыповы, сістэмны кіраўнік, шчыры, прывабны, адкрыты чалавек, яна згуртавала калектыў гістарычнага факультэта, неяк па-жаночы цёпла, але адначасова прынцыпова натхняла яго ўсе гады на прафесійную працу, на канчатковы вынік. І нядзіўна, бо да прыроднай сялянскай выхаванасці і прагматызму ў выкананні любой справы ў характары І. О. Царук далося галоўнае – высокая культура, універсітэцкая

адукацыя, шырокі жыццёвы кругагляд, дасведчанасць у гістарычным і сучасным палітычным жыцці, выдатныя здольнасці псіхолага і педагога.

Іраіда Осіпаўна нарадзілася ў в. Гаркавічы Сакольскага павета Беластоцкага ваяводства (цяпер – Польшча) у вялікай і дружнай сям'і Прытыцкіх. На жыццёвым шляху І. О. Царук, яе родных і блізкіх моцна адбіліся вірлівыя падзеі XX ст., геразім і трагізм падзей Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны. Іраіда Осіпаўна заўсёды мела памкненне да адукацыі. Вучылася спачатку ў польскай пачатковай школе, затым – у Беластоку, у эвакуацыі ў час вайны – у рамесным вучылішчы ў Маскве. У 1948 г. яна закончыла з адзнакай Нясвіжскае педагагічнае вучылішча і была накіравана на навучанне ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Вучылася на гістарычным факультэце, пасля завяршэння якога як выдатніца і імянны стыпендыят працягнула навучанне ў аспірантуры. У 1957–1963 гг. працавала ў Мінскім гаркаме, а затым у абкаме КПБ. У кастрычніку 1963 г. Іраіда Осіпаўна вярнулася на працу ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, з якім была звязана ўся яе далейшая працоўная дзейнасць. У 1965 г. І. О. Царук паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю «Дзейнасць Кампартыі Беларусі па рэалізацыі культурных пераўтварэнняў у заходніх абласцях Беларусі (1939–1953 гг.)». Працавала на кафедры гісторыі КПСС.

У 1973 г. І. О. Царук была абрана дэканам гістарычнага факультэта БДУ і прапрацавала на гэтай пасадзе 13 год. Сведкам першых дэканскіх гадоў Іраіды Осіпаўны быў А. А. Яноўскі: «Мне не прыходзіла тады ў галаву, што яна на той час сама па-новаму спасцігала свой родны факультэт, які яе выхаваў і даў пуцёўку ў жыццё, што ёй давялося перадумаць сотні разоў, каб жанчына на дэканскай пасадзе ўспрымалася як аўтарытэт для калектыву, а не "бледны цень" папярэдняга дэкана П. З. Савачкіна. Перад БДУ і ўсімі яго факультэтамі, а тым больш перад факультэтам "ідэалагічным", у 1970-х гг. з самых высокіх уладных кабінетаў ставіліся задачы грунтоўных зрухаў на шляху да рэалізацыі "лёсавызначальных" пастаноў партыі і ўраду». Пасля працы дэканам і да выхаду на пенсію І. О. Царук займала пасаду загадчыка кафедры гісторыі Беларусі. У 1975 г. Іраіда Осіпаўна абараніла доктарскую дысертацыю, стала прафесарам. У сферу навуковых інтарэсаў І. О. Царук уваходзіць даследаванне пытанняў палітычнай гісторыі Беларусі XX ст., нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР, разгортвання нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. У часы працы дэканам і загадчыкам кафедры раскрыліся выдатныя якасці Іраіды Осіпаўны як кіраўніка і выкладчыка, яе разуменне і здольнасць вырашаць надзённыя праблемы і забяспечваць патрэбы развіцця ўніверсітэцкай гістарычнай адукацыі і навукі. Неабыякавасць да даручанай справы ў І. О. Царук заўсёды спалучалася з паважлівым стаўленнем да калег і вучняў. Іраіда Осіпаўна з'яўляецца аўтарам звыш 100 навуковых публікацый. Пад яе кіраўніцтвам больш за 30 саіскальнікаў абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі.

Іраіда Осіпаўна Царук – выдатны прыклад жыцця пакалення, якое змагалася за Беларусь, за права «людзьмі звацца». Яна выдатны прадстаўнік знакамітай сям'і Прытыцкіх – Царукоў. Асобна адзначым важнасць выхаду ў свет мемуарных твораў Іраіды Осіпаўны. Гэта пранікнёныя апавяданні пра лёсы людзей, гатовых да самаахвяравання, поўныя прыкладаў сапраўднай мужнасці і геразму, асабліва карысныя для тых, каму выпадзе будаваць будучыню нашай краіны.

«У жыцці кожнага народа, асобнага чалавека прысутнічаюць пэўныя нябачныя, складана вытлумачаемыя сувязі, якія пранікаюць у розныя часавыя, тэрытарыяльныя вымярэнні і ствараюць тое асяроддзе, тыя ўмовы, якія вызначаюць твой лёс», – піша ў адной са сваіх кніг Іраіда Осіпаўна. Сапраўды, такія не адразу заўважныя лініі звязвалі і звязваюць гэтага выдатнага чалавека з яе паплечнікамі, сябрамі, калегамі, вучнямі.

Аўтары гэтых радкоў не толькі ганарацца тым, што ім давялося дастаткова доўга працаваць побач з І. О. Царук, але і лічаць Іраіду Осіпаўну сваім анёлам-захавальнікам, які ўвёў іх у наш універсітэцкі храм і замацаваў там на многія гады.

Іраіда Осіпаўна заўсёды шчыра цікавіцца развіццём роднага гістарычнага факультэта і ўніверсітэта. Яе хвалюе лёс тых, з кім яна працавала, і станаўленне маладых гісторыкаў, якія прыходзяць на змену. На самых важных мерапрыемствах факультэта І. О. Царук заўсёды разам з намі.

Ад імя калектыву гістарычнага факультэта БДУ шчыра віншуем Іраіду Осіпаўну з паважнай юбілейнай датай. Жадаем моцнага здароўя, бадзёрасці духу і доўгіх гадоў жыцця.

***А. Г. Каханоўскі***,
доктар гістарычных навук, прафесар
***С. М. Ходзін***,
доктар гістарычных навук, дацэнт
***А. А. Яноўскі***,
кандыдат гістарычных навук, прафесар